Уладзімір Карэлін, Мікалай Мельнікаў

# Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі

Vladimir Karelin, Nikolaj Melnikov

**The rare plots in the icon-painting of Belarus**

Some rare iconographic plots that occur in the Belarusian temples not more than three times are presented in the article. Brief descriptions of images of the saints and their iconographic interpretation are examined.

*Keywords:* icon, the holy martyrs, iconography, attributes

У статті представлені деякі рідкісні іконографічні сюжети, які зустрічаються в білоруських храмах не більше, аніж в три рази. Розглядаються короткі описи зображення святих і їхнє іконографічне трактування.

*Ключові слова:* ікона, святі мученики, іконографія, атрибути

У храмах Беларусі зафіксавана больш за 100 іканаграфічных сюжэтаў, якія сустракаюцца толькі ў некалькіх выпадках (не больш трох)[1]. Амаль усе яны адносяцца да сярэдзіны-канца 19 ст. і звычайна застаюцца па-за межамі інтарэсу навукоўцаў. Таму аўтары палічылі мэтазгодным увесці ў навуковы зварот гэтую частку твораў сакральнага мастацтва, што знаходзяцца ў праваслаўных храмах. У паведамленні разглядаюцца асаблівасці іканаграфіі асобных абразоў, прыводзяцца іх тэхнічныя дадзеныя і падаюцца кароткія звесткі аб персанажах, згодна літаратурных звестак. Дні шанавання святых прыводзяцца па грыгарыянскаму і юліянскаму календарах.

У адным з храмаў Драгічынскага раёна Брэсцкай вобл. захоўваецца адзіны занатаваны абраз аднаго з дванаццаці малых пракокаў — Аўдзія (мал. 1; канец XIX ст., дошка, алей, 111х63). Згодна падання, Аўдзій («служачы Богу») быў домаўпраўнікам ізраільскага цара Ахавы, які кіраваў у IX ст. да Н. Х. Пасля смерці прарок быў пахаваны ў Самарыі, а каля яго грабніцы адбывалася шмат цудаў. Памяць прарока Аўдзія шануецца 2 снежня (19 лістапада). На абразе Аўдзій падаецца ў выглядзе сівабародага старца з малітоўна складзенымі на грудзях рукамі, які стаіць басаном на зямлі. Гарыстая мясцовасць і стрыманая колеравая гама адзення прарока падкрэсліваюць сціпласць фігуры святога. Залацісты фон абраза дэкараваны геаметрычным арнаментам са стылізаванымі васьміпялёсткавымі кветкамі.

Св. Агата на ўсіх зафіксаваных абразах прадстаўлена разам з іншымі святымі. Так, на абразе з г. Орша Віцебскай вобл. яна паказана разам са св. Іаанам Багасловам (мал. 2; першая палова XIX ст., дошка, алей, метал, 70х55). Абраз амаль цалкам закрыты авальным чаканным абкладам, што надае дадатковую дэкаратыўнасць выяве. На заднім плане, паміж постацямі святых,

праглядаецца будынак храма. У верхняй частцы абраза, на воблаках, знаходзіцца паясная выява блаславуляючага Хрыста. Выява Хрыста прысутнічае і на творы з Зельвінскага раёна Гродзенскай вобл. (канец XIX ст., палатно, алей., 105x70), дзе святая знаходзіцца побач са святым пакутнікам Максімам. Яшчэ на адным абразе з Гродзеншчыны Агата падаецца разам са св. Аляксеем, мітрапалітам Маскоўскім і св. Ксеніяй. Святая Агата была дачкой багатых бацькоў-хрысціян з горада Палерма на Сіцыліі. У маладосці прыняла хрысціянства і захоўвала цноту. Яна адхінула дамаганні гарадскога прэфекта, за што вытрымала зневажэнне публічным домам, катаваннямі, у тым ліку адразаннем грудзяў, і была спалена на вогнішчы ў 251 г. Святая Агата шануецца ўсімі хрысціянамі. Лічыцца заступніцай жанчын ад сексуальных дамаганняў, ахоўвае ад пажараў і хваробаў свойскай жывёлы. Дзень шанавання каталіцкай царквой – 5 лютага, праваслаўнай царквой – 18 лютага.

Святая пакутніца Акіліна пацярпела за хрысціянскую веру пры імператары Дыёклетыяне (284 – 305), калі ёй было ўсяго 12 гадоў. Таму на адзіным абразе з Берастовіцкага раёна Гродзенскай вобл. (пачатак XX ст., палатно, алей, 150x68) яна адлюстравана ў выглядзе маладой дзяўчыны, якая стаіць басанож на пазёме. Галава святой пакрыта платам, у правай апушчанай руцэ яна трымае пальмавую сцябліну – сімвал пакутніцы. На Русі імя Акіліны ператварылася ў Акуліну, а вобраз трасфармаваўся ў Акуліну-грачышніцу, якая спрыяе ўраджаю грэчкі. Яе дзень адзначаецца 26 (13) чэрвеня.

Таксама толькі ў адзіным выпадку занатаваны вобраз Аляксандра прэпадобнага Свірскага (1448-1533), інака Валаамскага манастыра і заснавальніка Свірскага манастыра, што на беразе Рошчынскага возера, недалёка ад рэчкі Свір. Шанаванне святога пачалося адразу пасля яго смерці, а ў 1547 г. ён быў далучаны да стану святых. Дзень памяці – 30 (17) красавіка і 12 верасня (30 жніўня). Іканаграфія Аляксандра Свірскага злажылася ў другой палове 16 ст. і адпавядае традыцыі адлюстравання прэпадобных: сярэдніх гадоў, у манаскім аблачэнні, правай рукой блаславуляе, у левай трымае скрутак. Іканаграфія абраза з Гродзенскага раёна (канец XIX ст., палатно, алей, 88x39) адрозніваецца ад традыцыйнай тым, што святы прыціскае правую руку да грудзей[2].

У розных рэгіёнах Беларусі сустракаюцца абразы св. пакутніцы Анастасіі. У праваслаўным календары пад такім іменем узгадваюцца некалькі асобаў, а ў Праваслаўнай Энцыклапедыі[3] адзначаеца, што «иконографических особенностей в изображении различных святых с именем Анастасия не существует и точная идентификация образа возможна только при наличии сопроводительной надписи». На абразе з Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл. (канец XIX ст., дошка, алей, 120x95) св. Анастасія, з крыжам у левай руцэ, стаіць побач са святымі Варварай і Марыяй Егіпецкай. Над яе галавой

змешчаны надпіс «Св. Великомуч. Анастасія Узор», што азначае Анастасія Узавырашальніца – тая, хто палягчае – «вырашае» – пакуты вязняў-хрысціян. Яшчэ адзін абраз Анастасіі Узавырашальніцы зафіксаваны ў Нясвіжскім раёне Мінскай вобл. (мал. 3; пачатак XX ст., палатно, алей, 110x45). Звяртае ўвагу подпіс у ніжняй частцы кампазіцыі: «за упокой Р. Б. Анастасиі Плотко». Анастасія Узавырашальніца (Фармакалітрыя), па паходжанню знатная рымлянка, прыняла пакутніцкую смерць за хрысціянскую веру (яе спалілі на вогнішчы) у 304 г. у Сербіі, дзе яна дапамагала зняволеным хрысціянам. Грэчаскае найменне «Фармакалітрыя» перакладаецца як «сцаляючая ад атруты і хваробаў», таму на абразе з Карэліцкага раёна Гродзенскай вобл. (канец XIX ст., дошка, алей, 110x52) святая трымае ў левай руцэ слоік з цалебным алеем. Яна таксама лічыцца апякункай цяжарных жанчын. Святая шануецца і на Захадзе[4]; памяць святой Анастасіі ў каталіцкай царкве – 25 снежня, у праваслаўнай царкве – 4 студзеня (22 снежня).

На трох абразах зафіксаваны вобраз Андрэя Крыцкага – хрысціянскага святога VIII ст., які знаходзіцца ў ліку прападобнапакутнікаў. Ён вёў манаскае жыццё на Крыце і загінуў смерцю пакутніка, як прыхільнік шанавання абразоў, падчас іконаборчых ганенняў імператара Канстанціна Капроніма, прыкладна ў 760 г. Памяць святога адмячаецца ў праваслаўнай царкве 30 (17) кастрычніка. На абразе з Кобрынскага раёна Брэсцкай вобл. (мал. 4; канец XIX ст., палатно, алей, 120x53) св. Андрэй Крыцкі прадстаўлены ў поўны рост, у выглядзе сівабародага старца ў манаскім аблачэнні. У левай руцэ ён трымае абраз Маці Божай Адзігітрыі. У ніжняй частцы кампазіцыі змешчаны надпіс, палавіна якога закрыта рамай: «Жертва Крестъянъ въ благодарное воспоминаніе о бывшемъ Епископе Костромскомъ Александре […]». На двух іншых абразах, адзін з якіх прысвечаны выратаванню цара Аляксандра III падчас катастрофы 17 кастрычніка 1888 г., прыведзена паясная выява прападобнага з абразом Спасіцеля ў руках.

Святыя пакутнікі Адрыян і Наталля, якія былі мужам і жонкай, жылі ў Нікадзіміі Віфінскай і пацярпелі за хрысціянскую веру ў пачатку IV ст., пры імператары Максіміане. Яны лічацца апекунамі сям'і; дзень памяці адзначаецца 8 верасня (26 жніўня). На адзіным абразе з Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобл. (мал. 5; XIX ст., палатно, алей, 46x39) Адрыян і Наталля стаяць на беразе рэчкі, насупраць адзін аднаго, далоні рук Наталлі малітоўна складзены на грудзях. Позірк Адрыяна скіраваны ўверх, дзе на воблаках сядзіць блаславляючы Хрыстос.

У верхняй частцы ківота з абразом свяціцеляў маскоўскіх (Чашніцкі раён Віцебскай вобл.), у круглай раме, знаходзіцца паясная выява прападобнага Андроніка (канец XIX ст., палатно, алей, 44x44). У левай руцэ ён трымае

звітак, правай бласлаўляе. Андронік юнаком прыйшоў з Растова ў манастыр да Сергія Раданежскага і правёў там 10 гадоў манахам, пасля чаго стаў ігуменам манастыра, які ў Маскве заснаваў мітрапаліт Маскоўскі Алексій, дзе і прабыў да самой смерці, што адбылася 13 чэрвеня 1373(?) г. Кананізаваны прападобны Андронік (Маскоўскі) ў канцы XV ст. Дзень яго памяці 26 (13) чэрвеня і 19 (6) ліпеня.

У Аршанскім раёне Віцебскай вобл. захоўваецца абраз св. Анціпы Пергамскага (канец XIX ст., дошка, алей, 26х22), вучня Іаана Багаслова і епіскапа Пергамскай царквы. За свае хрысціянскія перакананні і адказ прынесці ахвяру ідалам, ён быў спалены ў 91 г. у медным быку ў храме Артэміды. Шануецца хрысціянскімі цэрквамі ў ліку свяшчэннапакутнікаў і лічыцца апекуном стаматолагаў. Дзень памяці Анціпы Пергамскага ў праваслаўнай царкве – 24 (11) красавіка. На ўпамянутым абразе прадстаўлена пагрудная выява сівабародага старца ў епіскапскім аблачэнні. У правай руцэ ён трымае крыж з распятым Хрыстом, у левай – закрытае Евангелле.

Адзіны абраз з выявай вялікапакутніка Арцёмія Антыёхійскага зафіксаваны ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобл. (мал. 6; канец XIX ст., дошка, алей, 70х55). Арцёмій быў военачальнікам пры імператары Канстанціне Вялікім. У часы праўлення Юліяна Адступніка, Арцёмій выкрываў яго палітыку аднаўлення язычніцтва, за што пацярпеў пакуты і прыняў смерць праз адсячэнне галавы ў 362 г. Дзень шанавання Арцёмія Антыёхійскага – 2 лістапада (20 кастрычніка). На абразе прыведзена роставая выява вялікапакутніка ў даспехах военачальніка. Святы паказаны з сівой барадой і непакрытай галавой. Левай рукой, з пальмавай сцяблінай у далоні, ён абапіраецца на шчыт; правая – прыціснута да грудзей.

У адрозненне ад шматлікіх выяў архідыяканаў Стэфана і Лаўрэнція, у храмах Беларусі даволі рэдка сустракаюцца выявы пакутніка дыякана Вікенція. Апошні быў вучнем Валерыя, епіскапа Сарагосы, і прапаведаваў хрысціянства жыхарам горада. Падчас ганенняў на хрысціян імператара Дыёклетыяна, Вікенцій разам з Валерыем былі схоплены і адпраўлены на суд у Валенсію. Пасля шматлікіх катаванняў Вікенцій быў спалены на раскаленай сетцы 22 студзеня 304 г. Ён лічыцца заступнікам вінаградараў, дні яго шанавання – 24 (11) лістапада (праваслаўная царква) і 22 студзеня (каталіцкая царква). Звычайна святы Вікенцій адлюстроўваецца ў выглядзе маладога безбародага юнака ў дыяканскім аблачэнні, як на абразе з Вілейскага раёна Мінскай вобл. (мал. 7; 1879 г., палатно, алей, 104х70). У правай руцэ ён трымае кадзільніцу, у левай, на ўзроўні грудзей, – чашу з прычасцем. Зверху, на воблаках, знаходзіцца паясная выява бласлаўляючага Хрыста. У Іўеўскім раёне Гродзенскай вобл. і Міёрскім раёне Віцебскай вобл. (другая палова 19 ст., палатно, алей, 118х50) выявы Вікенція з кадзільніцай у правай руцэ змешчаны на бакавых дзвярах іканастасаў.



*Мал. 1. Прарок Аўдзій. Канец 19 ст. Драгічынскі раён Брэсцкай вобл.*



*Мал. 2. Св. пакутніца Агата са св. Іаанам Багасловам.*
*Першая палова 19 ст. г. Орша Віцебскай вобл.*




*Мал. 3. Св. пакутніца Анастасія. Пачатак 20 ст. Нясвіжскі раён Мінскай вобл.*



*Мал. 4. Св. прападобнапакутнік Андрэй Крыцкі. Канец 19 ст. Кобрынскі раён Брэсцкай вобл.*



*Мал. 5. Св. пакутнікі Адрыян і Наталля. 19 ст. Ляхавіцкі раён Брэсцкай вобл.*



*Мал. 6. Св. вялікапакутнік Арцёмій Антыёхійскі. Канец 19 ст.; Карэліцкі раён Гродзенскай вобл.*




*Мал. 7. Св. пакутнік дыякан Вікенцій. 1879 г.; Вілейскі раён Мінскай вобл.*



*Мал. 8. Св. свяшчэннапакутнік Уласій. 19 ст.; Столінскі раён Брэсцкай вобл.*



*Мал. 9. Цуд св. Уласія. 19 ст. Лідскі раён Гродзенскай вобл.*



*Мал. 10. Св. пакутнік Ваніфацый. Канец 19 ст. в. Жыровічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобл.*

У Мастоўскім раёне Гродзенскай вобл. зафіксавана выява раннехрысціянскага святога пакутніка Віктара Дамаскага (канец XIX ст., палатно, алей, 54х34), які ў II ст. служыў у рымскім войску і адказаўся прынесці ахвяру язычніцкім багам. Калі пасля жорсткіх катаванняў яму адрубілі галаву, з цела выцекла кроў з малаком. У Віктара просяць дапамогі пры хваробах рук і вачэй, яго памяць адмячаецца 14 траўня (каталіцкая царква) і 24 (11) лістапада (праваслаўная царква). На абразе прадстаўлена пакаленная выява святога ў маладым узросце, з невялікай цёмнай барадой. Ён у воінскіх даспехах і плашчы, у правай руцэ трымае крыж – сімвал пакутніка.

Шырока вядомы свяшчэннапакутнік Уласій у храмах Беларусі прадстаўлены толькі на трох абразах. Святы Уласій быў епіскапам г. Севасція, што ў Малай Азіі. Ён быў лекарам, лячыў людзей і дапамагаў вязням-хрысціянам. Пад час ганенняў Дыёклетыяна святога арыштавалі і, пасля жорскіх катаванняў, ў 316 г. яму адсеклі галаву. Святы Уласій лічыцца апекуном жывёлы і таму на абразах, што раней вешалі ў хлявах, малюецца ў атачэнні худобы. Дні шанавання – 24 (11) лютага (праваслаўная царква) і 3 лютага (каталіцкая царква). На абразе са Столінскага раёна Брэсцкай вобл. (мал. 8; XIX ст., дошка, алей, 52х43) знаходзіцца паясная выява святога ў епіскапскім аблачэнні і з непакрытай галавой. Правай рукой ён благаслаўляе, у левай трымае закрытае Евангелле. Абраз выкананы ў своеасаблівай іканапіснай тэхніцы, характэрнай для паўднёвых рэгіёнаў Беларусі, і вылучаецца графічнасцю і колеравай маляўнічасцю пісьма. Паабапал ліка Уласія змешчаны буйныя стылізаваныя кветкі, што надае абразу дадатковую дэкаратыўнасць.

На творы з Лідскага раёна Гродзенскаой вобл. (мал. 9; XIX ст., палатно, алей, 86х68) паказана адно з цудаў святога, калі ён дастае рыбную костку з глоткі юнака і тым выратоўвае яго ад смерці.

Яшчэ адным малавядомым святым з'яўляецца пакутнік Ваніфацый, які пацярпеў за Хрыста ў 290 г., у часы праўлення рымскіх імператараў Дыёклетыяна і Максіміана (284—305). Ваніфацый дапамагае ад вінапіцця і распусты, бо сам быў пазбаўлены гэтых грахоў. Дзень яго памяці 1 студзеня (19 снежня). На абразе з Жыровіцкага манастыра (мал. 10; канец XIX ст., палатно, алей, 150х70), святы пакутнік Ваніфацый, які адлюстраваны ў выглядзе маладога юнака з непакрытай галавой і крыжам у левай руцэ, знаходзіцца разам са святым Антоніем Вялікім. На чатырохчасткавым абразе з Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобл. (канец XIX ст., дошка, алей, метал, 21х17) Ваніфацый прадстаўлены сумесна з Маці Божай Казанскай, Спасам Усеўладным і св. Мікалаем. У левай руцэ ён трымае скрутак з надпісам: «Владыко Вседержитель [...]».

Як бачна з вышэйсказанага, амаль усе прадстаўленыя выявы святых пакутнікаў адпавядаюць іканаграфічнаму канону – гэта франтальныя роставыя

ці паясныя адлюстраванні. У руках яны трымаюць крыжы ці пальмавыя сцябліны – сімвалы пакутніцтва, а таксама скруткі з надпісамі і кнігі. У некаторых у руках знаходзяцца абразкі Маці Божай ці Спаса. Кампазіцыя абраза можа быць дапоўнена выявай бласлаўляючага Хрыста на воблаках, ці архітэктурнымі элементамі.

[1] Карэлін У., Мельнікаў М. Распаўсюджанне іканаграфічных сюжэтаў ў іканапісу Беларусі 16 – пач. 20 ст. // Przeglad Wschodni. – Tom VII. Zeszyt 3(27). – Warszawa, 2001. – S. 671-684.

[2] Холл Дж. Словарь сюжетов и символов в искусстве. М. – 1999.

[3] Православная энциклопедия; электронная версия. http://www.pravenc.ru/

[4] Католическая энциклопедия. – Т. 1 (А-З). – Москва, 2002.